ДЗЕСЯЦЬ ГОД ВСНГ БССР.

24-га сьнежня мінулага году, споўнілася 10 г. в моманту арганізацыі ВСНГ у Саюзс. СНГ у Беларусі на падставе дэкрэту ўраду быў арганізаваны 1-га студзеня 1918 г. (19 сьнежня 1917 па ст. ст.) і такім чынам 1-га студзеня 1928 г. мінае 10 год яго існаваньня.

Работу і дзейнасьць СНГ у БССР трэба падзяліць па два перыяды—з 1-га студзеня 1918 г. па лістапад 1920 г. і з лістапада 1920 г. па сучасны момант.

Першы савет народнай гаспадаркі Заходняй вобласьці і фронту быў арганізаваны 2-га студзеня 1918 г. Старшынёю яго быў назначан тав. Казлоў. Савет народнай гаспадаркі ў пачатку знаходзіўся ў памяшканьні, якое цяпер займае СНК, а потым у будынку ЦК КП(б)Б. Першы ВСНГ, па думцы законадаўцы, павінен быў заняцца не толькі пытаньнямі нацыяналізацыі прадпрыемстваў і іх кіраўніцтвам, але, галоўным чынам, пытаньнямі забесьпячэньня арміі неабходнымі прадметамі абмундыраваньня. У лютым 1918 г. Менск быў акупаваны немцамі, і першы савет народнай гаспадаркі Заходняй вобласьці і фронту, існаваўшы ўжо каля месяцу, эвакуіраваўся ў г. Смаленск. 10-га студзеня 1919 году Менск быў заняты чырвонымі войскамі. У першай палове студзеня 1919 г. у памяшканьні, якое займае цяпер ЦСПСБ, пачаў функцыянаваць Менскі гарадзкі губарскі савет народнай гаспадаркі начале з тав. Гашчынскім.

У пачатку лютага 1919 году, з выданьнем дэкрэту аб утварэньні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, Менскі губсаўнархоз рэарганізуецца ў СНГ БССР.

У пачатку сакавіка 1919 году, з заняцьцем Чырвонай арміяй гор. Вільні, арганізуецца ВСНГ Літвы і Беларусі. Старшынёй яго быў тав. В. З. Гінзбург (Тураў) і яго намесьнікамі т. т. Б. Г. Заке і Я. Н. Падольскі. У Менску-ж зноў застаецца ГСНГ начале з тав. Гашчынскім.

21-га мая 1919 году ўрад Літвы і Беларусі эвакуіруецца ў Бабруйск.

Прадпрыемствы ў гор. Менску перадаюцца ў распараджэньне Менгарсавету.

8-га жніўня 1919 г. Менск быў заняты белапалякамі, і 14 жніўня ВСНГ Літбел, разам з другімі дзяржаўнымі ўстановамі, эвакуіруецца з Бабруйску ў гор. Смаленск, дзе і адбываецца ліквідацыя ВСНГ Л. і Б.

У ліпені 1920 г., пасьля вызваленьня гор. Менску ад белапалякаў, тав. Вайнэр па даручэньні ўраду прыступае да арганізацыі СНГ БССР.

Зразумела, што, знаходзячыся амаль увесь час у стане эвакуацыі, зрабіць шмат нельга было. Толькі звароце СНГ БССР з Рослаўлю з лістапада 1920 г. началася і праводзіцца плянавая работа па на стварэньні кіраўніцтва прамысловымі прадпрыемствамі БССР.

Упачатку ВСНГБ быў арганізаваны па існаваўшай у той час так званай «главкистской» сыстэме. Пры ВСНГ для кіраўніцтва адпаведнымі галінамі прамысловасьці быў створаны цэлы рад аддзелаў: Лесбел, Белгандаль, аддзел мэталу і інш. Прадпрыемствы былі падпарадкаваны з аднаго боку па тэрыторыяльнай адзнацы ВСНГ, з другога боку—адпаведным аддзелам ВСНГ БССР.

Такое-жа падвойнае падпарадкаваньне было з боку ВСНГ БССР і яго аддзелаў прэзыдыуму ВСНГ РСФСР і яго шматлікім главкам.

Але калі ў той час, у перыяд так званай старой эканамічнай палітыкі, калі рынку ня было, калі главкі, аддзелы і ВСНГ загадвалі толькі забесьпячэньнем прадпрыемстваў сырцом і разьмеркаваньнем іх прадукцыі па нарадах, гэты вялікі лік інстанцый і падвойнасьць падпарадкаваньня была пярпіма, але з увядзеньнем НЭП'у, існаваўшая структура ВСНГБ патрабавала карэннай рэарганізацыі, якая і была праведзена ў адпаведнасьці з пастановамі першага зьезду Савету Народнае Гаспадаркі (28 ліпеня 1921 г.).

У асноўным рэарганізацыя выявілася ў наступным: саўнаркозы, як непатрэбныя інстанцыі, былі ліквідаваны.

Частка прадпрыемстваў была перадана павятовым выканкомам, рэшта прадпрыемстваў была аб'яднана ў так званыя групавыя ўправы, а некаторыя пакінуты на правах самастойных гаспадарчых адзінак. Аб'яднаньне адбывалася як паводле вытворчых, так і тэрытарыяльных адзнак. Групавыя ўправы і самастойныя гаспадарчыя адзінкі былі непасрэдна падпарадкаваны прэзыдыуму ВСНГ БССР праз створаныя ім функцыянальныя ўправы.

Усе былыя губаддзелы былі ліквідаваны. Частка іх функцый была перадана панова арганізаваным гаспадарчым адзінкам. Пры гэтым апарат ВСНГ БССР і яго аддзелаў значна скарацілся—31.009 штатных адзінак у ліпені 1921 г. да 113 чалавек у верасьні 1922 г.

На працягу ўсяго наступнага перыяду, у адпаведнасьці з напрамкам усёй гаспадарчай палітыкі і значным пашырэньнем праў і абавязкаў трэстаў і прадпрыемстваў, структура ВСНГБ паступова зьмянялася ў бок захаваньня за сабою толькі асноўных функцый па рэгуляваньні, кіраўніцтве і плянаваньні. Структура ВСНГ БССР, якая існуе цяпер, бязумоўна, зьяўляецца больш спрошчанай, чым гэта было ў параўнаньні з мінулым.

Аднак, ВСНГ БССР, ставячы перад сабою і ўсёй прамысловасьцю задачу правядзеньня настаноў 1-га пленуму ВСНГ Саюзу аб далейшай цэнтралізацыі плянавага кіраўніцтва і рэгуляваньня, коўнай дэцэнтралізацыі апэрацыйных функцый і адмовы ад дробнай апекі,—павінен будзе імкнуцца да далейшага ўдасканаленьня свайго апарату ў бок спрашчэньня і паменшаньня яго работы.

Мы ўпэўнены, што ў бліжэйшым будучым мы зможам канстатаваць далейшыя посьпехі ВСНГ БССР і ў гэтым напрамку.

Пагосцкі.

На парозе другога дзесяцігодзьдзя.

Пасьля захвату рабочай клясай улады, ВСНГ меў на мэце аб'яднаць работу ўсіх эканамічных установаў. Ня толькі ўрэгуляваньне пытаньняў, якія датычаць вытворчасьці, але і забесьпячэньне прамысловасьці сырцом, грашмі, харчам і іншымі сродкамі, неабходнымі для прамысловасьці, сталі ў цэнтры ўвагі ВСНГ.

Першы перыяд існаваньня ВСНГБ, зьвязаны з зьбіраньнем прамысловасьці, нацыяналізацыяй яе, наладжаньнем арганізацыйных момантаў, арганізацыяй фронту, забесьпячэньнем Чырвонай арміі, да пачатку НЭП'у—прайшоў пад знакам захаваньня нацыяналізаванай прамысловасьці і абароны краіны.

1921-22 г.—зьяўляецца першым перыядам работы прамысловасьці на ўмовах новай эканамічнай палітыкі. Моцна цэнтралі аванас праўленьне зьмяняецца перыядам набліжэньня апарату да вытворчасьці, а таксама ўзмацненьнем агульнага рэгуляваньня і лявіраваньня прамысловасьцю. Апарат ВСНГБ перабудоўваецца.

Адначасова быў наложаны пачатак зьмене форм аплаты працы рабочых, які меў рашаючае значэньне, як для паленшаньня матар'яльнага становішча рабочых, так і паляпшэньня мэтадаў работы і вытворчасьці.

Пашырэньне рынкавых адносін, уздым матар'яльнага становішча рабочае клясы, павялічэньне ёмкасьці рынку высунілі перад ВСНГБ задачы арганізацыі збыту, аздараўленьне і ўдасканаленьне вытворчасьці, якія і атрымалі сваё частковае вырашэньне ў 1922-23 г.; была зьменена і сама сыстэма арганізацыі прамысловасьці. Зьдзяйсьняюцца першыя крокі па правядзеньні ў жыцьцё арэднай палітыкі, якая мела на ўвазе вызваленьне ВСНГ ад непасрэднага кіраўніцтва дробнымі прадпрыемствамі і зарочваньне цэнтральнай увагі на буйную прамысловасьць, што прызвана адыгрываць кіруючую ролю ў нашым сацыялістычным будаўніцтве.

1923-24 год, зьяўляючыся перыядам значнага пашырэньня прамысловасьці, далейшай рацыяналізацыі вытворчасьці і зьніжэньня адпускных цэн, адначасова быў адзначаны для БССР гістарычнаю датаю, якая мела асаблівае значэньне для народнае гаспадаркі рэспублікі. Згодна пастановы ЦВК да БССР была далучана Віцебшчына. Побач з агульнымі задачамі, ВСНГБ прымушаны быў заняцца ўстаноўкаю новых арганізацыйных форм.

Наступныя гады (1924-25-26) высоўваюць перад ВСНГБ самую ўдарную задачу—паленшаньне якасных момантаў работы прамысловасьці. Цэнтрам увагі зьяўляюцца пытаньні далейшага павышэньня прадукцыйнасьці працы, усямернай рацыяналізацыі вытворчасьці і паташэньня сабекошту. Яшчэ больш завастраецца праблема вывучэньня і вызначэньня бліжэйшых перспэктыў разгортваньня прамысловасьці. ВСНГ прыступае да арганізацыі работы па складаньні 5-ці гадовых праграм.

1926-27 год, які амаль поўнасьцю закончыў аднаўленчы працэс прамысловасьці, вывязаны са значнымі дасягненьнямі ў галіне плянаваньня. Складаньне кантрольных лічбаў і першае вызначэньне 5-ці гадовага перспэктыўнага пляну разьвіцьця прамысловасьці, што зьяўляецца галоўным матар'ялам, які акрэсьлівае бліжэйшы лёс прамысловага жыцьця БССР — восьмыя новыя вехі работы ВСНГБ. Капітальнае будаўніцтва, электрычнае будаўніцтва (Асінстрой) і вывучэньне мінэральных багацьцяў краіны (работы горнага аддзелу), якія кладуць асноўную базу пад далейшае разьвіцьцё прамысловасьці, пачынаюць займаць цэнтральнае месца ў рабоце ВСНГБ.

1926-27 год быў адзначаны новай гістарычнай датай—далучэньнем Гомельшчыны. Адпаведна з гэтым была праароблена параўнаўча вялікая арганізацыйная работа, якая таксама ня можа быць выкрэслена з гісторыі існаваньня ВСНГБ.

Вось тыя асноўныя этапы работы ВСНГБ на працягу першага 10-годзьдзя існаваньня сав. улады.

Аглядваючыся назад, нельга ня ўспомніць аб вялікім фактары, які меў вялізарнейшае значэньне ў нашых посьпехах. Гутарка ідзе **аб фабрычна-заводзкіх камітэтах, якія да ажыцьцяўленьня дэкрэту** аб арганізацыі ВСНГБ падрыхтавалі глебу да захвату і кіраўніцтва прамысловасьцю. На працягу ўсяго дзесяцігодзьдзя **прафсаюзы і іх низавыя ячэйкі, а таксама арганізаваныя потым вытворчыя камісіі і нарады**—зьяўляліся падставаю арганізацыі народнае гаспадаркі краіны.

Уступаючы ў другое дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня і ўсьведамляючы ўсе тыя труднасьці, якія стаяць перад намі па вырашэньні цэлага раду задач, ВСНГ пры дапамозе ўсяе рабочае клясы пойдзе на шляху далейшых перамог.

А. Шульман.

Пашырэньне беларускага экспарту.

Грамадзкасьць і экспарт.—Каапэрацыя ня выканала заданьня.—Вываз запалак.—Пытаньне аб тары.

Экспартная нарада, якая адбылася на днёх пры Эканомнарадзе БССР, прызнала неабходным, каб у хатах-чытальнях, народных домах і клюбах праводзіліся гутаркі са зьмяшчэньнем артыкулаў і заметак у насьценных газэты аб экспарце. Да гэтай справы павінны быць прыцягнуты аграномы, школьныя і каапэрацыйныя працаўнікі.

Бібліятэкі, народныя дамы, клюбы і хаты-чытальні павінны быць забясьпечаны папулярнай літаратурай па замежным гандлі.

На сходах пайшчыкаў усіх відаў каапэрацыі і на сходах прафсаюзаў (асабліва рабземлесу, дрэваапрацоўчікаў, харчавікоў і прамсьпеты) трэба ставіць на абмеркаваньне пытаньне аб экспарце.

На сходах дэлегатаў, работніц і сялянак у праграмы працы павінны быць уключаны пытаньні экспарту асабліва аб канкрэтных мерапрыемствах па зборы яек, курэй, гусей, ануч, рагоў, капытаў, касьцей, грыбоў, ягад і г. д.

Экспартная нарада прызнала неабходным выданьне папулярных брашур і плякатаў па экспарце.

Адначасова павінны быць выпушчаны кіно-фільмы для вёскі на тэму, чым гандлюе за граніцай Савецкая Беларусь.

Для большай папулярызацыі экспарту пасходна перадаць даклады і інфармацыю аб экспартных справах на радыё.

Нарада адзначыла, што Белсельсаюз у працы на загатоўцы тавараў для экспарту выканаў 40—50 проц заданьня на першы квартал г. г., таму праца Белсельсаюзу ў гэтым напрамку прызнана незадавальняючай.

Белсельсаюзу прапанавана выканаць гадовае заданьне па экспарце.

Западкавы трэст інфармаваў нараду аб тым, што фабрыка „Дзепр" у першым квартале дала каля 25 тыс. скрынак запалак, а ў 2-ім квартале дасьць 50 тыс. скрынак. Пасьля абсталяваньня новай фабрыкі „Дзепр" прадукцыя экспартных (стандартных) запалак павінна павялічыцца.

У мэтах павялічэньня вытворчасьці экспартных запалак на фабрыцы „Дзепр" запрапанавана прэзыдыуму ВСНГБ тэрмінова абмеркаваць пытаньне аб павялічэньні колькасьці зьмен рабочых на фабрыцы.

Пры абсталяваньні фабрыкі „Чырвоная Вярэзіна" апошняя зможа давець штогод фанэрных сядзеньняў для крэслаў на суму 100 тыс. р.

Загатоўка тары як для экспарту, так і для ўнутранога рынку, ускладзена на беларускі саматужна-прамысловы саюз, Лесбел і Лесзаг. Пры гэтым саматужны саюз будзе забясьпечаны неабходнай колькасьцю поўфабрыкатаў—колатай і пілёнай клёпкай, дошкамі на скрынкі і г. д.

Усе арганізацыі, якія маюць патрэбу ў тары, абавязуюцца зрабіць саматужнаму саюзу падрабязныя гадавыя заяўкі. Даручана саюзу саматужнікаў зараз жа прыступіць да арганізацыі арцеляй для загатоўкі тары, запрасіўшы тэрмінова высока-кваліфікаваных спэцыялістых інструктароў.

У Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР.

(Пасяджэньне за 28 сьнежня г. г.).

Абавязковая здача скур у засолку.

Эканамічная Нарада пастанавіла ўвесьці абавязковую здачу ў засолку скур забойнае жывёлы ня толькі ў гарадох, але і ў тых мясцовасьцях, дзе няма бойняў або забойных пунктаў. У гэтых мясцовасьцях скуры здаюцца ў засолку ў засолачныя пункты дзяржаўных і каапэрацыйных плянавых загатоўчыкаў аб'ва бліжэйшыя бойні. Дзейнасьць гэтай пастановы распаўсюджваецца толькі на прыватных асоб, якія скупляюць жывёлу для перапродажы мясных прадуктаў. Органы ветэрынарнага нагляду пры вяльменьні мяса павінны патрабаваць ад гатчык асоб квітанцыі або пасьведчаньні аб здачы скур для засолкі на бойню або на засолачныя пункты.

Барацьба з дамавым грыбком.

За апошні час распаўсюджваньне дамавога грыбка ў БССР прыняло эпідэмічны характар, вынікам прычыняю распаўсюджаньня гэтага грыбка зьяўляецца ўжываньне ў будаўніцтве сырога матар'ялу. Паколькі гэты грыбок псуе пабудовы, Эканамічная Нарада прызнала неабходным зьнішчыць ужываньне сырога будаўнічага матар'ялу і запрапанавала Вышэйш. Сав. Нар. Гасп. распрацаваць і прадставіць у Эканамічную Нараду да 1-га лютага 1928 г. канкрэтныя захады пераходу да такога становішча, каб з першага кастрычніка 1929 г. ня [illegible] проц. лясного будаўнічага матэ[illegible] дапускалася са складаў Лесбелу [illegible] дзе, дзе вільгаці было-б ня[illegible] проц.

[illegible] і арганізацыі, якія загатаўляюць будаўнічы лесматар'ял, павінны ўвачатку будаўнічага сэзону застаўляць будаўнічым арганізацыям для адказных канструкцыйных частак будынкаў толькі сухі лес.

Пачынаючы з будаўнічага сэзону 29 г., катэгарычна забаронена ўсім будаўнікам ужываць для сказаных, не даступных для сталага нагляду і слаба вентылюемых месц пабудовы сыры лясны матар'ял і ўжываць для іх толькі сухі лес, дзе вільгаці было-б ня больш 19 проц., а калі гэта будзе немагчыма выканаць, то трэба ўжываць дэзынфэкцыю будаўнічага лесу.

Таксама забаронена ўжываньне на ўсіх будаўнічых работах дрэва, пашанаванага грыбком, без папярэдняй дэзынфэкцыі.

Для ўжываньня гэтай пастановы выдаецца спэцыяльная інструкцыя.

Апрача таго, запрапанавана ВСНГ зрабіць абсьледаваньне лясных складаў для выяўленьня пашанаванай грыбком драўніны і каб зьнішчыць заразу, а таксама запрапанавана цэламу раду ўстаноў і арганізацыі зрабіць абсьледаваньне будынкаў, лесазагатовак і лясных баз, каб зрабіць захады для барацьбы з дамавым грыбком, у прыватнасьці НК Аховы Здароўя запрапанавана набудаваць эксперыментальныя камэры і правесьці дасьледчыя работы па барацьбе з дамавым грыбком і іншымі шкодніка[illegible].

Да перавыбараў у рабочай каапэрацыі

„...У далейшым не паслабляць увагі гэтай працы, імкнуцца павялічваць і ўзмацняць пралетарскую каапэрацыйную грамадзкасьць".

(З пастаноў 6-га ўсебеларускага зьезду прафсаюзаў).

МЦРК дае справаздачу упоўнаважаным.

(На агульным сходзе).

28-га сьнежня адбыўся агульнагарадзкі сход упоўнаважаных МЦРК, на якім прысутнічала 115 чал. З інструкцыйным дакладам аб дзейнасьці МЦРК за мінулы гаспадарчы год выступіў тав. Зінгерман. Даклачык спыніўся на дасягненьнях МЦРК: лік пайшчыкаў павялічыўся на 7.200 ч.; кіраўнічы апарат, ня гледзячы на рост зваротаў, значна скарочаны; вакол каапэратыву створаны моцны актыў з 600—700 ч.; гандлёвыя звароты за год павялічыліся на 3 міл. руб.; сетка крам пашырылася на 21; бюджэт пайшчыка ахоплен на 60—65 процантаў. З недахопаў каапэрацыйнай працы тав. Зінгерман адзначыў—вялікую чаргу ў крамах, слабасьць крамнай сеткі на акраінах і г. д. Потым быў заслухан даклад загадчыка апэрацыйнага аддзелу тав. Вальфсона аб кантрольных лічбах зваротаў на 1927-28 год. На закупку сельска-гаспадарчых прадуктаў будзе выдана каля 3 міл. рублёў.

Член праўленьня тав. Гравіт зачытаў каштарыс на 1927-28 год. Ён рабіў даклад усяго... 10 хвілін і прапанаваў сходу абмяркаваць каштарыс. Але ўпоўнаважаныя не атрымалі загадзя каштарысу для азнаямленьня, а таму пастанавілі адкласьці абгаворваньне каштарысу. Трэба больш уважліва аднесьціся да каапэрацыйнага актыву.

А.

Узмацніць барацьбу з перапрадажай.

Справаздачна-перавыбарчы сход пайшчыкаў Камуністычнага Унівэрсытэту, які адбыўся 30-га сьнежня, прайшоў з вялікай актыўнасьцю, пры дзелавой крытыцы працы МЦРК з боку студэнтаў-пайшчыкаў. Прысутнічала да 100 чалавек. Малая колькасьць прысутных тлумачыцца тым, што пачаліся зімовыя выкацыі.

Заслухана была справаздача аб дзейнасьці МЦРК за мінулы апэрацыйны год. Дакладчык у кароткіх рысах ахарактарызаваў рост пайшчыкаў і зваротаў, асаблівая ўвага была ўдзелена грамадзкаму харчаваньню.

Неабходна канстатаваць і актыўны ўдзел студэнтаў-пайшчыкаў у спрэчках. Выступаўшыя таварышы адзначалі неабходнасьць узмацненьня выхаваўчай працы сярод пайшчыкаў па лініі саюзаў, а таксама палепшаньня ўзаемаадносін паміж прыказчыкам і спажыўцом.

У сваім паказе новаму праўленьню студэнцтва зьвярнула асаблівую ўвагу на ўрэгуляваньне пытаньня па забясьпечаньні брэдытаваньня неабходнымі таварамі.

Трэба ўзмацніць барацьбу з перапрадажай тавараў, што перашкаджае ўзмацненьню каапэрацыі на рынку. Аднагалосна прынята рэзалюцыя, якая адзначыла вялікія дасягненьні ЦРК за мінулы перыяд. Потым была заслухана справаздача ўпоўнаважанага МЦРК перад абіральнікамі аб праробленай працы.

Вельмі добра прайшлі перавыбары ўпоўнаважанага. Неабходна адзначыць, што кампанія па падрыхтоўцы перавыбараў началася своячасова, што выявілася на самым сходзе.

Г-ч.

Бязупынны рост.

(Ліст з Віцебску).

Віцебскі ЦРК з'арганізаваўся ў 1923 г. шляхам аб'яднаньня асобных каапэратываў, якія існавалі на тэрыторыі гораду. З году ў год ЦРК шпарка рос. Так, у 1923 г. ён меў 2.761 пайшчыка і 4.503 р. паявых капіталаў; на 1-га кастрычніка 1927 г. пайшчыкаў ёсьць 17.502 і 93.800 руб. паевых капіталаў. Зварот па продажы тавараў павялічыўся ад аднаго мільёна руб. у 1923 г. да 6 з пал. мільёнаў руб. у 1926-27 г.

Такому шпаркаму разьвіцьцю рабочае каапэрацыі ў Віцебску дапамагаюць шырокія масы працоўных. Рабочыя і работніцы, актывістыя і актывісткі - упоўнаважныя чэлны крамных камісій і інш. заўсёды выведваюць недахопы каапэрацыі і аб гэтым паведамляюць праўленьне ЦРК. Каля 400 рабочых і работніц упягнута ў актыўную працу цэрабкопу і з кожным месяцам павялічваецца лік пайшчыкаў. За кастрычнік месяц уступіла 862 новыя пайшчыкі і сабрана 9.000 р. паявых капіталаў.

Да 10-годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі Віцебскі ЦРК меў сваіх членаў 18 з пал. тысяч і звыш 100.000 рублёў паявых капіталаў. З агульнай колькасьці пайшчыкаў членаў прафсаюзу—70 проц.

Г.

Пашырыць гандаль сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

БАРЫСАЎ. (Уласн. кар.). Яшчэ ў мінулым годзе праўленьне Барысаўскага ЦРК абгаворвала чытаньне аб павялічэньні сельска-гаспадарчых прадуктаў у гарадзкой каапэрацыі. Было пастаноўлена адкрыць у горадзе адну малочную краму, але гэта пастанова засталася пастановай толькі на паперы.

Трэба сказаць, што ў сучасны момант яшчэ прыватны гандаль займае важнае месца, і насельніцтва на 50 проц. купляе ў прыватніка с.-г. прадукты.

За адсутнасьцю каапэрацыйных крам па продажы [illegible] тавараў рабочыя ідуць да прыватніка і пераплачваюць шмат даражэй. Апрача ўсяго гэтага ЦРК не здавальняе поўнасьцю пайшчыкаў мясам. Напрыклад, у каапэрацыі налічваецца звых 4500 пайшчыкаў, а зварот мяса ў 5-ці крамах дасягае ўсяго 35 пуд. Неабходна ў 1928 г. адкрыць адну краму па малочным гандлі. Новаму праўленьню ЦРК трэба ў першую чаргу павялічыць колькасьць с.-г. гандлю ў гарадзкой каапэрацыі і пабіць прыватніка.

А. Станкевіч.

Увага дробязям у ахове працы.

Няшчасныя выпадкі яшчэ ня зжыты.

(Менскі вучастак Заходняй чыгункі).

Шмат кіраўнічых матар'ялаў дана было камісіям па ахове працы пры мясцкомах. Былі праведзены спэцыяльныя нарады на вучастках.

Але многія камісіі аховы працы працуюць без пляну і сыстэмы, плянавае абсьледаваньне прадпрыемстваў ня робіцца, а калі дзе робіцца, то налётам, бяссыстэмна. Акты накіроўваюцца адразу ў вучком, бяз прад'яўленьня прапаноў камісіі самой адміністрацыі. Наогул, выходзіць падвойная праца. Камісіі пішуць у учкирафсож, учкирафсож зварочвае іх адносьнікі.

Звышнормавыя работы яшчэ ня зжыты. Няшчасныя выпадкі на вытворчасьці бываюць даволі часта. На службе эксплёатацыі зламаў сабе руку рабочы Тарасэвіч, бо ня быў агароджаны драбінамі. Рабочы Юркавец нёс на плячох рысору і быў цяжка паранены—ня было насілак, каб несьці. Кандуктар Чыстапятаў расьціснуты буферамі—ён рабіў расцэпку, але шляхі ня былі своячасова ачышчаны.

На зьнішчэньне звышнормавых работ, на зьнішчэньне няшчасных выпадкаў трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Гур'ян.

Камісія—на вышыні

(Завод „Чырвоная Зара" (Менск).

Камісія па ахове працы за апошні час шырока разгарнула сваю работу. У склад камісіі ўваходзіць 7 чалавек, якія працуюць у розных аддзяленьнях заводу. Кожны член камісіі сочыць за тым, каб у яго аддзяленьні было ўсё добра, і калі толькі паўстае якое-небудзь пытаньне, то зараз-жа яно ставіцца на пасяджэньні камісіі. Нажаль, у працы камісіі прыймае ўдзел нязначны процант рабочых.

Пастановы камісіі адміністрацыяй выконваюцца. Так, напрыклад, у заторшчыкаў ня было кубкаў і чайнікаў. Камісія пастанавіла, каб адміністрацыя закупіла гэтыя рэчы. Цяпер ужо заторшчыкі забясьпечаны чайнікамі і кубкамі.

У разьдзявальні адсутнічала электрычнае сьвятло, у новым павэтрадувачным аддзяленьні ня было драбін для адчыненьня і зачыненьня вэнтыляцыі, у патачным заводзе адсутнічала выцяжная вэнтыляцыя. Прапановы камісіі адносна зьнішчэньня гэтых недахопаў адміністрацыяй выкананы.

Б—к.

Ня ўсё—ў парадку.

(Каўбасная фабрыка Белмясгандлю).

На нашай фабрыцы ня ўсё ў парадку. У падвальным памяшканьні холадна працаваць, неабходна ўстанавіць поч.

Вяпрукі дастаўляюцца часта ў момант сканчэньня працы. Яны застаюцца на ноч неразабранымі і замярзаюць, а мёрзлых вяпрукоў цяжка разьбіраць.

Акрамя таго, неабходна пачаць рамонт вадаправоду, бо ў выпадку адліг фабрыка можа быць заліта вадой. Мяса на фабрыку дастаўляецца з перабоямі. Усе гэтыя недахопы абгаворваліся на вытворчай нарадзе. Адміністрацыі прапанавана іх зьнішчыць.

М.

Новыя калдагавары.

Дасягнута згода з Шклатрэстам.

Як мы паведамлялі ў нумары 287 «Зьвязды», перагаворы саюзу хамікаў з Шклатрэстам зацягваліся з-за некаторых спрэчак па паасобных пунктах калектыўнага дагавору. Аднак 28-га сьнежня згода была дасягнута па ўсіх пунктах бяз перадачы справы ў канфліктныя органы.

Трэст згадзіўся пабудаваць і пераабсталяваць лазьні да 1-га жніўня з правам дармовага карыстаньня рабочымі і іх сем'ямі адзін раз у тыдзень.

Бягучы рамонт кватэр рабочых павінен рабіцца за кошт трэсту, але не за кошт фонду на паляпшэньні быту.

В.

Падвышана зарплата па ўсіх групах служачых.

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта).

Гомельскае аддзяленьне саюзу савецкіх і гандлёвых служачых пасьпяхова скончыла кампанію па перазаключэньні калектыўных дагавораў. Галоўныя асаблівасьці новых калдагавораў наступныя:

— У гэтым годзе ўводзіцца аклады па пасадах за лік нязначнага (да 10 проц.) зьніжэньня зарплаты высока-аплачаемых груп працаўнікоў; падвышан заработак нізка-аплачаемых груп (курэраў, уборшчыц); устаноўлена паасобная плата за нагрузку; дасканальна абгавораны абавязкі кожнага працаўніка.

З дагавораў, асабліва належыць адзначыць дагавары з Белжылсаюзам і Гомельскім ЦРК. Па гэтых дагаворах **звышнормавая праца служачых і прыказчыкаў не павінна перавышаць 48 гадзін у месяц**; за гэтыя 48 гадзін павялічана зарплата на 25 проц. **Фонд зарплаты гандлёвай групы працаўнікоў ЦРК падвышан на 2 проц.** Гэта дазваляе павялічыць зарплату нізка аплачаемых груп працаўнікоў прылаўку і вучняў. Акрамя таго, усе працаўнікі прылаўку замацавалі за сабой права на адзін выхадны дзень ў тыдзень, а напярэдадні сьвята яны будуць канчаць працу на 2 гадзіны раней (раней гэта запатрабаваньне кодэксу выконвалася дрэнна).

А. Мядзеліц.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ АД НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Электрыфікацыя Магілеўшчыны.

Скончана пабудова Чавускай станцыі.

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

Да канца бягучага гаспадарчага году магутнасьць сеткі электрастанцыі Магілеўшчыны ўзрасьце ўдубальт у параўнаньні з цяперашнім часам і дасягне 1.065 кілёват-гадзін.

Праз месяц распачне працу Чавуская электрастанцыя, моц якое пашырэцца да 75 кілёват-гадзін супроць цяперашніх 12. Будынак ужо скончаны, ёсьць электрычнае абсталяваньне, прыбыў лёкамабіль у 100 конскіх сіл.

Гэта станцыя забясьпечыць цалком як самы горад Чавусы, так і бліжэйшую вёску Зарэчча—электрасьвятлом. Электра-энэргіяй забясьпечваюцца мясцовыя прадпрыемствы — лесапільня, друкарня, саматужныя майстэрні, прафтэхшкола, кіно і інш.

Готымі дням дан заказ на лёкамабіль у 100 конскіх сіл для Быхаўскай электрастанцыі. Для яе будынак скончаны, прыбыла частка электрычнага абсталяваньня, [illegible] як горад, так і бліжэй[illegible] моц сваёй электрастанцыі і даводзіць яе да 800 кілёват-гадзін. У канцы лета будзе пастаўлен новы рухавік-генэратар у 650 конскіх сіл, коштам у 135.000 р. Патрэба ў павялічэньні станцыі ўжо даўно насьпела. Сучасная станцыя задавальняе толькі каля 25 проц. патрэбы васельніцтва і прамысловасьці. Ужо даўно новыя заяўкі на ўключэньне электрычнасьці на выконваюцца. Пашыраная станцыя дасьць электра-сьвятло [illegible] і Вашчанскага Сяргея—

ЧАВУСКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ.

Ліст бэльгійскіх рабочых.

ВОРША (Уласн. кар.). Аршанскі акрпрафсавет атрымаў ліст з Бэльгіі ад членаў бэльгійскай рабочай дэлегацыі, якія ў лістападзе месяцы па дарозе з Масквы ў Менск наведалі Воршу. У лісьце гаворыцца:

— Нашы сходы і мітынгі карыстаюцца вялікім посьпехам і выклікаюць энтузіязм у нашай рабочай клясы. Ня гледзячы на хлусьню і паклёпы, якія распаўсюджваюцца буржуазным друкам і сацыял-дэмакратыяй адносна стаповішча Савецкіх рэспублік—праўда выплывае наверх і колькасьць нашых прыхільнікаў павялічваецца з кожным днём.

Капіталізм дажывае апошнія дні. Рэфармістыя з дня на дзень трацяць глебу пад нагамі.

Мы вас вельмі просім трымаць нас у курсе ўсяго таго, што дзеецца ў вас, пісаць нам аб вашых дасягненьнях і наогул аб усіх мерапрыемствах, якія прымаюцца вамі для паляпшэньня становішча вашага вялікага народу. Усё гэта выклікае вялікую цікавасьць у нас.

Жанета праца па [illegible] Стэфан [illegible] эрт.

ВОПЫТ КАНТРАКТАЦЫІ ПАСЕВУ.

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

Сёмета сельска-гаспадарчым саюзам праведзен вопыт кантрактацыі насеву.

Члены сельска-гаспадарчых каапэратываў атрымлівалі падвойныя ільготы: ім давалася на папер на два гады насьпяя і задатак пад будучы ўраджай. Як папярэдні год быў няўражайным, дык жадаючых закантрактаваць насевы знаходзілося больш, чым на гэта было прызначана сродкаў.

Усяго было закантрактавана да здачы 138.000 кілёграмаў насьпяя ільна-даўгунца, 24.000 ільна-валакна і 7.000 насьпеня канюшыны.

Наконт насьпеня канюшыны—справа зусім добрая: вёска атрымае на пляне каля паўтысячы пуд. насьпеня канюшыны, якое выгадавана ў нашых умовах. Таксама сельсаюз атрымаў ізоўную колькасьць ільна-валакна.

Але вось несадзяваная гісторыя з насьпеньнем ільна-даўгунца. Яно прымаецца па павышанай цэне, але адрозьніць яго ад насьпеня звычайнага нашага ільна-кудраша немагчыма без спэцыяльнага аналізу. Такім чынам, прадаваць сялянству атрыманае па кантрактацыі насьпеньня, як мінавіта насьпеньне ільна-даўгунца і, наогул немагчыма будзе гэта рабіць датуль, пакуль даўгунец зусім ня выпіхне ў данай мясцовасьці лёкудраш.

З некаторых месц (Прысьнянскае с.-г. таварыства) паведамляюць, як быццам лён-даўгунец не падыходзіць да нашае глебы і быццам мясцовы лён сеяць больш карысна. Агранамі трэба гэта праверыць.

К. Л.

Адусюль.

ВОРША. (Уласн. кар.). За згвалтаваньне 15-гадовай дзяўчыны [illegible] суд прысудзіў Анікіенкава Ісака і Гальмакова Міхася, з вёскі Заволн[illegible] Дубровенскага раёну, да 7 год [illegible] абавуленьня волі, а Анікіенка[illegible] і Вашчанскага Сяргея—

— У вёсцы Бобчан, Селецкага сельсавету [illegible] на), зарганізавана [illegible] ое ўзахо[illegible] ...

Абмен зьняволенымі паміж СССР і Польшчай.

Польскі ўрад паводле падпісанай згоды з Савецкім ураі дам выдае СССР 9 палітычных вязьняў, якія былі прыгавораны да зьняволеньня на розныя тэрміны.

Замест 9-ці асоб, якія передаюцца СССР, савецкі ўрад выдае Польшчы 33-х вязьняў, якія былі прыгавораны да зьняволеньня савецкім судом за злачынствы на розныя тэрміны.

Абмен адбудзецца сёньня ў поўдзень на прыгранічнай станцыі Коласава ў прысутнасьці афіцыяльных прадстаў нікоў польскага і савецкага ўрадаў.

Для ўдзелу ў абмене з Масквы прыехаў у Менск дарадчык польскай місіі п. Зелядзінскі.

Абмен будзе рабіць упоўнаважаны НКЗС пры урадзе БССР т. Казюра.

Сёньня для спатканьня прыяжджаючых у СССР палітвязьняў выяжджаюць на граніцу прадстаўнікі МОПР'у, прафесыянальных і грамадзкіх арганізацый.

У Менск цягнік з польскімі таварышамі прыбудзе а 6 гад. увечары.

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

[illegible] сьнежня пад [illegible] прэзыдыуму ЦВК.

Разглядзелі ад пытаньняў:

I. Аб скліканьні зьездаў нацменшасьцяй.

У мэтах падагульваньня праведзенай культурнай і эканамічнай работы сярод нацменшасьцяй, а таксама вызначэньня мерапрыемстваў на дзелсішы час, прэзыдыум ЦВК пастанавіў склікаць на 8 студзеня 1928 г. усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў і на 20 студзеня 1928 г.—зьезд сялян-яўрэяў.

Названыя зьезды нацменшасьцяй праводзяцца ад імя нацкамісіі ЦВК і пад не непасрэдным кіраўніцтвам.

II. Сыстэма народнай асьветы.

Заслухан даклад Наркамасьветы т. Баліцкага аб сыстэме народнай асьветы.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў пытаньне аб сыстэме народнай асьветы паставіць на сэсіі ЦВК у парадку паравнаньня абгаварэньня в тым, каб пасьля сэсіі адпаведныя матар'ялы былі разасланы на месцы для абгаварэньня, пасьля чаго пытаньне будзе зноў унесена на разгляд бліжэйшай сэсіі, або чарговага Зьезду Саветаў. Дакладчыкам гэтага пытаньня вызначан т. Баліцкі.

Прэзыдыум ЦВК таксама пастанавіў запрасіць на сэсію для ўдзелу ў разглядзе пытаньня аб сыстэме народнай асьветы прадстаўнікоў Наркамасьветы ўсіх саюзных рэспублік.

III. Аб пашырэньні на тэрыторыю былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў кодэксаў БССР.

Зацьверджан, унесены СНК БССР, праект пастановы ЦВК і СНК БССР пра пашырэньне на тэрыторыю былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў грамадзянскага, грамадзянска-працэсуальнага, крымінальна-працэсуальнага і земляпрадпрыемствага кодэксаў і ветэрынарнага статуту БССР. Названыя кодэксы і статут пашыраюцца на тэрыторыю былых Гомельскага і Рэчыцкага паветаў з 1 студзеня 1928 году замест дзейных там кодэксаў і ветэрынарнага статуту РСФСР.

IV. Пра поўнамоцтвы народных заседацеляў.

Зацьверджан, унесены СНК БССР, праект пастановы ЦВК і СНК БССР пра працяг да 1-га студзеня 1929 г. поўнамоцтваў народных заседацеляў, выбраных у 1927 г.

V. Аб рэарганізацыі сельскіх саветаў Гомельскай акругі.

Зацьверджан, унесены СНК БССР, праект пастановы ЦВК і СНК БССР аб рэарганізацыі сельскіх саветаў Гомельскай акругі. Згодна паказанай пастановы, існуючыя на Гомельскай акрузе 463 сельскія саветы рэарганізуюцца ў 217 саветаў, у тым ліку нацсаветаў: расійскіх—14, польскіх—6, украінскіх—2, яўрэйскіх—2. Гомельскаму Акрвыканкому даручана правесьці падрыхтоўчую працу па рэарганізацыі сельскіх і местачковых саветаў, адначасова з правядзеньнем падрыхтоўкі саветаў да перавыбараў.

VI. Аб правядзеньні нацпалітыкі па акругах.

Прэзыдыум ЦВК згадзіўся з прапановай Нацкамісіі ЦВК аб заслухоўваньні на пасяджэньнях прэзыдыуму ЦВК дакладаў Віцебскага і Бабруйскага Акрвыканкомаў па пытаньнях правядзеньня нацпалітыкі ў гэтых акругах. Нацкамісіі ЦВК даручана зрабіць праверку на месцах выкананьня дырэктыў ураду аб нацпалітыцы з тым, каб потым разам з дакладамі адпаведных Акрвыканкомаў заслухаць і садаклады Нацкамісіі ЦВК.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ.

Саюзная праца на прыватных прадпрыемствах.

На апошнім пасяджэньні ЦСПСБ тав. Юхзін зрабіў даклад аб дадатковым абсьледваньні саюзнай працы сярод рабочых на прыватных прадпрыемствах.

Прэзыдыум ЦСПСБ па гэтым дакладзе вынес рад пастаноў: момант пера ключэньня дагавораў з прыватнымі наемцамі павінен выбірацца саюзамі ў найбольш выгадны для саюзаў па ўмовах вытворчасьці час.

Зарплата ў прыватных прадпрыемствах, як агульнае правіла павінна быць вышэй, чым у дзяржаўных прадпрыемствах. Там, дзе зарплата ніжэй зарплаты ў адпаведных дзяржпрадпрыемствах, саюзам неабходна ўзяць курс на павышэньне яе. Неабходна ў прыватных прадпрыемствах практыкаваць сыстэму пачасовай зарплаты, дапускаючы простую зьдзельшчыну толькі ў тых прадпрыемствах, дзе такая ўжо ўкаранілася (абутковая вытворчасьць), адпак пры абавязковай умове гарантыраваньня тарыфных ставак.

Камісія па правядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня.

Для распрацоўкі мерапрыемстваў па правядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня ў прамысловасьці Беларусі прэзыдыум ЦСПСБ выдзеліў камісію ў складзе наступных таварышоў: Ісаева (старшыня), Розін (намесьнік), Латанурсні (чыгуначнік), Гурэвіч (ад мэтазістых), Конанаў (ад хэмікаў), Бэнэк (ад Наркампрацы), Руманаў (ад гарбароў), Бэрэліна (ад шэйнікаў) і Бурдун (ад дрэваапрацоўшчыкаў).

Скарачэньне выдаткаў на прафсаюзны апарат.

Прэзыдыум зацьвердзіў каштарыс ЦСПСБ у суме 215.000 рублёў.

Вынесена пастанова аб скарачэньні канцылярскіх, паштова-тэлеграфных і дробна-гаспадарчых выдаткаў па ЦСПСБ і па ўсіх АСПС на 13 проц. у параўнаньні з выдаткамі 1927 г. Адначасова пастаноўлена скараціць сетку райпрафбюро па Гомельскай, Магілеўскай і Аршанскай акругах. У кожнай з гэтых акруг будзе ліквідавана адно райпрафбюро. Каштарыс будзе перададзены на канчатковае зацьверджаньне падыходзячаму пленуму.

Масавая прафлітаратура на нацыянальных мовах.

На гэтым жа пасяджэньні былі разгледжаны матар'ялы да падыходзячага пленуму ЦСПСБ па дакладзе рэдакцыйна-выдавецкага аддзелу ЦСПСБ.

У пачатку працы рэдакцыйна-выдавецкага аддзелу—в 1926 г.—выдана 50 кніг в агульным тыражом у 120.000 экз. На беларускай мове выдана 20 кніг, яўрэйскай—28, польскай—2 і расійскай—3. Тыраж беларускіх кніг 42.000 экзэмпляраў, яўрэйскіх—65.000, польскіх—3.000 і рускіх—7.000.

Усе гэтыя матар'ялы рыхтуюцца да пленуму ЦСПСБ.

СУД.

„Жыватворчая вада".

Рабочым і служачым Заходніх чыгунак, аматарам выпіць, далёка ісьці на гэта не прыходзілася. Каля самай станцыі жыла гр-ка Жывіцкая, якая ў любы час дня і ночы адпускала „жыватворчую воду". Трэба адзначыць, што ў Жывіцкай была вельмі вялікая клієнтура. Дасягала яна гэтага, у якоўчы таму што гарэлку давала ў доўгі, волькі хочаш і [illegible] пры атрыманьні пенсіі. Акрамя гэтага Жывіцкая дазваляла арганізоўваць папойкі на сваёй кватэры пры ня актыўным удзеле.

Будучы сама вясёлага характару, яна часта запрашала сваіх прыяцелек і ў кватэры праходзілі шумныя выпіўкі, якія канчаліся часта ў міліцыі.

Жонкі рабочых ужо ведалі, што калі мужы прападалі, дык іх трэба шукаць у Жывіцкай. Ня супакойвала Жывіцкую і тое, што яна часта бывала біта жонкамі сваіх клієнтаў, што часта ламалі ў яе вокны і г. д., але, нягледзячы на ўсё гэта, яна ня спыняла сваю сьпіртагабясьпечваючую дзейнасьць.

На суде яна хоча адмовіцца ад продажы гарэлкі, кажучы, што проста да яе зьбіраліся прыяцелі і жаніхі і выпівалі Сьведкі даказваюць, што Жывіцкая акрамя сваёй хатняй дзейнасьці займалася таксама продажам гарэлкі, прычы у даволі шырокіх разьмерах.

Нарсуд 3-га вучастку, разьгледзеўшы гэтую справу прыгаварыў Жывіцкую да 1 г. 6 м. пазбаўленьня волі, але прысасаваўшы Кастрычніцкую амністію скараціў кару да аднаго году.

„Шырокая натура".

Галяшкевіч, на гледзячы на свае 20 год, ужо мае вялікія заслугі ў хуліганскіх справах. 5 раз Галяшкевіч ужо стаяў перад судом за хуліганства і ўсяму крымінальнаму яго вялікае імкненьне выпіць.

Спачатку вораўства на Савецкай вул. вынішчы чалавек, які ішоў і скідаў сваю вопратку, пакуль на скінуў з сябе апошнюю камізэлю і не застаўся зусім голым. Гэта і быў Галяшкевіч. На будучы [illegible] прыставу [illegible]

Нарсуд 3-га вучастку, прымаючы пад [illegible] частую сурэзнасьць Галяшкевіча [illegible] карыў яго да 1 г. 2 мес. пазбаўленьня [illegible] без прыгасаваньня зны[illegible]

МЕНСК

Пабудова галянтарэйнае фабрыкі у Менску.

У гэтым годзе ў Менску будзе пабудована вялікая галянтарэйная фабрыка па вырабе цэлюлёідных і рагавых грабянёў, а таксама гузікаў—цэлюлёідных, рагавых, касьцяных і галалітавых.

У даваенныя часы ў Менску была разьвіта галянтарэйная вытворчасьць. Наліччa некаторых відаў сыравіны і паўфабрыкатаў, кваліфікаваная рабочая сіла, якая захавалася, і наліччa некаторых прадпрыемстваў, стварае ўсе прадпасылкі для арганізацыі гэтае вытворчасьці ў г. Менску.

Да 1917 году у Менску існавала фабрыка цэлюлёідных вырабаў, на якой працавалі 280 чалавек. Зараз у Менску працуе арцель з 16 чалавек, якая вырабляе выключна жаночыя грабяні, як самыя рэнтабельныя. Таксама ў Менску нядаўна адчынілася прыватная майстэрня для вырабу цэлюлёідных грабянёў. Апрача таго ў Менску ёсьць некалькі майстэрняў па вырабе рагавых грабянёў і гузікаў.

Попыт на памянёныя вырабы намнога перавышае іх вытворчасьць. Цэны на гэтыя вырабы моцна павялічаны.

Выходзячы з гэтых матываў, прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў пабудаваць у Менску, у гэтым годзе, галянтарэйную фабрыку. Фабрыка будзе мець два корпусы. У першым корпусе, аднапавярховым, будуць вырабляцца з цэлюлёіду грабяні, шпільки, гузікі і іншыя цэлюлёідныя вырабы, а таксама грабяні з рагоў, якія маюць вялікі попыт на [illegible]. У другім, двухпавярховым, корпусе будуць зьмешчаны вырабы рагавых і касьцяных гузікаў, упаковачнае і [illegible]чнае памяшканьне, сталоўка, разьдзявальня і кантора.

З сыравіны цэлюлёід зьяўляецца імпортным таварам, а рогі і косьць—выключна мясцовыя.

Фабрыка будзе складацца з шмат аддзяленьняў—каля 15. У першым аддзяленьні цэлюлёід будзе разрэзацца нажамі на палосы і пласьцінкі патрэбных разьмераў. Рогі і косьці ў гэтым-жа аддзяленьні будуць цыркулярнаю пілою расьпілоўвацца на розныя пласьцінкі.

У дубляным аддзяленьні будзе праводзіцца насечка і разрубка зубоў. У прэсавым цэху матар'ялы прэсамі штампуюцца ў грабяні, гузікі і інш. У фрэзэрным цэху праводзіцца першапачатковая аддзелка ўсіх вырабляемых рэчаў.

У шліфавальным аддзяленьні вырабы з дапамогаю шліфавальных машын робяцца гладкімі і прыгоднымі для навядзеньня глянцу.

Будынак грабянёвага корпусу з прычыны асаблівых умоў вытворчасьці вусім не дапушчае зносін паміж асобнымі цэхамі. Таму гэты будынак спраектаваны ізаляваным з асобнымі залямі, і будзе пабудаван выключна з агнярывалымі матар'ялаў. Для лягкі перадачы паўфабрыкатаў з цэху ў цэх і бясьпечнасьці вытворчасьці будынак грабянёвага аддзяленьня спраектаваны аднапавярховым. Усе іншыя корпусы будуць двухпавярховымі.



Праект будынку галянтарэйнай фабрыкі.

Новы фізыятэрапэўтычны інстытут.

Па атрыманых вестках Саюзны СНК зацьвердзіў каштарыс на пабудову ў Менску пры нэрвовай клініцы новага фізыятэрапэўтычнага інстытуту. Інстытут будзе складацца з аддзяленьняў для лячэньня вадой электрычнасьцю, сьвятлом, токам высокай напружанасьці, а таксама аддзяленьні мэхана-тэрапіі. Акрамя таго пры гэтым інстытуце марнуецца адчыніць артапэдычныя аддзяленьні. Намячаецца арганізацыя вопытнага аддзяленьня для фізкультурнікаў.

З адчыненьнем інстытуту ўдасца павялічыць ёмкасьць нэрвовай клініцы. На першы год будаўніцтва адпушчана 25.000 руб. Акрамя таго частку сродкаў марнуецца атрымаць па лекавым фондзе. Будаўніцтва разьлічана на 2 з пал. гады. Да працы будзе прыступлена ў гэтым жа годзе. Праект інстытуту ўжо зацьверджаны.



Праект будынку інстытуту.

За дзень.

10.000 РУБ. НА СКАНЧЭНЬНЕ РАМОНТУ ДОМА ПРАЦЫ. Прэзыдыум ЦСПСБ уключыў у каштарыс на 1928 г. подпуск 10 000 руб. на скончэньне рамонту Дома працы ў Менску.

ЗУБАЎРАЧЭБНЫЯ МАТАР'ЯЛЫ І РЫБІ ТЛУШЧ. Беларкадзаль атрымаў вялікую партыю зубаўрачэбных матар'ялаў для патрэб БССР і вялікую колькасьць рыбінага плушчу, які адпускаецца па рацэптах. Атрыманая колькасьць тлушчу вусім забясьпечыць патрэбы насельніцтва на зімовы сэзон.

ПАБУДОВА ФАРМАЗАВОДУ. Пабудова фармазаводу здана в таргоў Белдзяржэстрою, які ўжо прыступіў да звозу необходных будаўнічых матар'ялаў на месца пабудовы. Завод будзе пабудаваны па раду вуліцы Дзяржынскага і Грыбаедаўскай.

МЭХАНІЗАЦЫЯ БЛЯШАНАГА ЦЭХУ. На заводзе «Усток» мэханізаваны бляшаны цэх. Мэханізацыя выявілася ва ўстаноўцы двух новых варштатаў. Дзякуючы гэтаму павялічылася колькасьць выпускаемай прадукцыі, а таксама і палепшылася яе якасьць.

ГАРАДЗКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ. Абрана менская гарадзкая выбарчая камісія ў складзе т. т. Рабіновіча (старшыня), Гершона (акругком), Брустыя (работніца першай друкарні), Лунгіна (рабочы-будаўнік), Захаранай (жанадзел), Кулака (ЦСПСБ), Шнейдэра (КСМ) і Сердзіца (Чырвоная армія).

Напярэдадні сэсіі ЦВК БССР.

У Менск ужо пачалі зьяжджацца на сэсію члены ЦВК. Ужо прыехалі некаторыя дэлегаты в Мавыршчыны, Полаччыны, Бабруйшчыны, Гомельшчыны і іншых акруг.

Сёньня адкрываецца пленум центральнай бюджэтнай камісіі ЦВК.

У часе сэсіі для членаў ЦВК будзе наладжаны рад экскурсій на прамысловыя прадпрыемствы і ў розныя культурныя ўстановы. Для іх жа ў Дзяржтэатры будуць даны некаторыя пастаноўкі. Марнуецца таксама скліканьне некаторых нарад з удзелам членаў ЦВК.

Галоўнавука БССР.

Пры Наркамасьветы на правах управы арганізуецца Галоўнавука БССР (Галоўная ўправа на справах навуковых і навукова-дасьледчых устаноў). Пад загадваньнем Галоўнавукі будуць знаходзіцца навукова-дасьледчыя інстытуты і катэдры, дзяржаўная бібліятэка і ня аддзяленьні, музэі, ахова помнікаў прыроды, старасьветчыны, быту і мастацтва і г. д., экспедыцыі, якія маюць асабліва важнае дзяржаўнае значэньне, падрыхтоўка навуковых працаўнікоў, навуковых таварыстваў, кіраваўчыя арганізацыі і г. д.

Старшынёй Галоўнавукі назначаны тав. Некрашэвіч.

15 рэнтгэнаўскіх габінэтаў для БССР.

Белмедгандаль атрымлівае з-за граніцы 12 новых рэнтгэнаўскіх габінэтаў. Тры габінэты атрыманы 31 сьнежня мінулага году.

Здарэньні.

— Затрыманьне п'яных. 31-га сьнежня і 1-га студзеня на гораде Менску было затрымана і дастаўлена ў адзяленьні міліцыі каля 20 п'яных.

— За хуліганства. Рабочы заводу „Беларусь" Ліпман 1-га студзеня ў часе вечарынкі ўварваўся ў чужую кватэру на Пролетарскай вул., 30, зрабіў скандал і разьбіў вокны. Ліпман прыцягнецца да адказнасьці.

ТЭАТР--КІНО.

„БАКХАНКІ" (БДТ-2).

„БДТ2, пачынаючы праву з атэнскай трагедыі, ня меў на моце аднавіць атэнскі тэатр, але ўзяў трагедыю, як комплекс яскрава пададзены ў пераживаньнях у пэўнай кампазыцыі, надаўшы ей трактоўку, якая-б гучала ў сучасьнасьці і стварала-б вострую сувязь паміж сцэнаю і глядачом", так гаворыцца ў досьць вялікім артыкуле, зьмешчаным у праграме спэктаклю «Бакханкі». Але і гэты спэктакль ня вырашыў ні ў якой меры пытаньня рэпэртуарнага голаду,—асноўнае, чаго не дастае БДТ-2. І зноў яшчэ раз нельга гаварыць аб „вострай сувязі паміж сцэнаю і глядачом".

Зусім зразумела, што БДТ-2, зьвяр нуўшыся да стара-грэцкіх аўтараў, спыніўся на Эўрыпідзе. Эўрыпід—тварэц бытавое трагедыі, рэвалюцыянэр і рэфарматар старое трагедыі, які свядома зьвёў гэроіку з іх недасяжных вышынь і абедзьвюма нагамі паставіў на зямлю, ёсьць найбольш блізкі да нас паміж старых паэтаў. Гэта аб ім сказаў Сафокль, што ён „малюе людзей такімі, якія яны ёсьць у сапраўднасьці". Бацька тэатру характараў, Эўрыпід умее глыбока ўзрушаючы маляваць пачуцьці і палы, якія даводзяць да шалеспства. Ён ведае чалавека і гаворыць аб чалавеку, а не аб гэроі. І таму тэатр, які «ўзяў трагедыю, як комплекс яскрава паданых пераживаньняў", мог зьвярнуцца толькі да Эўрыпіда.

Але ў глядача зьяўляецца зьдзіўленьне, чаму з тых 19 п'ес Эўрыпіда, якія дайшлі да нас, тэатр спыніўся на „Бакханках". Згадаем, што „Бакханкі" напісаны Эўрыпідам над старасьць, калі неспакойны мысьліцель і сафісты пачаў прымірацца з жыцьцём, калі адзяжелі [illegible] і запушчаны [illegible] старажытных заваёвана варвар[illegible]цыны. Калі ў сьвядомасьці заспавалі думкі, што

Шчасьлівыя людзі, якія ўбеглі
Ад бурнаго мора і ў прыстань прыйшлі.

Вось з гэтых, а не з якіх-небудзь іншых прычын п'еса стаіць „не як асобна ў шэрагу яго твораў" (гл. праграму „Бакханкі").

І нам здаецца, што праўда на баку тых дасьледчыкаў, што бачаць у „Бакханках" гарачую абарону старыны, старых законаў, „якіх ня здолее абвергнуць жадное чалавечае слова, якое-б яно ня было мудрае".

Бязумоўна, справядліва, што ў асобе Пентэя ніяк нельга бачыць сьмяшнага рацыяналістага, бо ён абаронца старога старых багоў і толькі. Аб такім разуменьні Пентэя нават в спасылкаўкем на Нэстле гаворыцца і ў праграме „Бакханкі" на 8 стар. Але на стар. 9 тэйжа праграмы мы чытаем штосьці іншае „Пентэй, у якога пачаў разьвівацца рацыяналізм, крытычна адносіцца да традыцыйных старых багоў(?) і змагаецца з бакхічным культам Дыяніса".

А хто-ж пераможца ў трагедыі, як не старына і прадстаўнік яе Пентэй. Так, Пентэй гіне, але яго сьмерць і ёсьць як-раз яго перамогай, перамогай яго веры: сьмерць расплюшчыла вочы, куды вядзе новае і магчыма культ Дыяніса, а ня рэлігія. Гэта трэ[illegible] памятаць.

Калі выбіраць з рэчаў Эўрыпіда, дык можна знайсьці нмат лепшага за „Бакханкі", якіх, да слова, унікаюць станіцы эўрапейскія і расійскія тэатры. Чаму-б ня спыніцца, ну хоць-бы на „Іпаліце", на гэтай трагедыі пераразьдзеленага злачынага каханьня Фэдры, ці на „Медэі" з калізіяй пачуцьця - помсты в пачуцьцём мацярынскага каханьня? Ці хоць бы на „Іфігеніі"?

Рэпэртуарны голад, які так [illegible] адчувае БДТ-2 настаноўкаю „Бакханак" не зьмяншаецца і пытаньне рэпэртуару і надалей застаецца самым злабочным пытаньнем у БДТ-2.

Ня гледзячы на ўсю пажадасьць настаноўкі, калектыў тэатру застаўся на значнай сьціні Праўда, з афарбленьнем п'есы і разуменьнем, якое надаў ей В. Смышляеў, у некаторых момантах нельга згадзіцца.

Зварачае на сябе ўвагу і пакідае моцнае ўражаньне выкананьне ролі Агавы, маціры Пентэя, С. Станютай. Даволі чыста правёў ролю Дыяніса Б. Рагавоска, хоць ён куды лепшы выканаўца бытавых роляй.

Уладзімер Жыма.

Чарговая хроніка Белдзяржкіно.

Белдзяржкіно сабрала ўсё тое, што зьняло ў Менску за апошнія тыдні. І выпусьціла чарговую кіно-хроніку. Сюды ўваходзіць зьезд КП(б)Б, сьвяткаваньне АДПУ, міліцыі і адчыненьне ўсебеларускай мастацкай выстаўкі.

Бязумоўна, усе гэтыя моманты заслугоўваюць быць зафіксаванымі ў фільме і выяўляюць цікавасьць для глядача. асабліва для правінцыяльнага. Разам з тым нельга прызнаць здавальняючай самы падыход да стварэньня кіно-хронікі.

Фактычна яна складаецца з кадраў, якія малююць твар асобных удзельнікаў пасяджэньняў, і толькі. У кіно-хроніцы адсутнічае дынамічнасьць, жвавасьць. Возьмем, напрыклад, зьезд КП(б)Б. Тут праўда, за выключэньнем асоб мы маем яшчэ рад цытат з прамоў выступаўшых. Але ў кіно надпісы ня ўпоўніваюць: трэба менш пісаць, а больш паказваць. Бязумоўна, магчыма было шляхам мультыплікату ілюстраваць некаторыя з цытат.

І зьезд КП(б)Б, і сьвяткаваньне АДПУ і ўрачыстае пасяджэньне праваўнікоў міліцыі—зьняты на адным і тым-жа рэпэрце. Усё паўтараецца — мяняюцца толькі асобы. Трэба-ж было крыў інакш паказаць усе гэтыя тры факты, а ня „дуць" на пэўным штампе.

Ня будзем затрымлівацца на тэхнічных недахопах гэтай кіно-хронікі, бо тут на зусім вінавата Белдзяржкіно.

Адпак і ў гэтых адносінах можна штосьці зрабіць, карыстаючыся для [illegible] зьмкаў лепшай апаратурай. Тэхніка зараз ня робіць Белдзяржкіно, значыць, мусіць, справу стварэньня кіно-хронікі не надта важнай.

З усёй кіно-хронікі здавальняючымі зьяўляюцца кадры, якія малююць мастацкую выстаўку, тэхнічна яны добра зроблены. Шкада толькі, што не здецца ніякіх тлумачэньняў аб тым, што [illegible] выяўлене пэўным малюнак хто яго творца.

Белдзяржкіно павінна прыняць у далейшым рад мер, каб урэгуляваць і палепшыць вытворчасьць беларускае кіно-хронікі.

А.

Сустрэча палітвязьняў.

Сёньня ЦК МОПР'у Бел. і Менскі акругком МОПР'у ладзяць сустрэчу прыбываючым абмененым палітвязьням з польскіх астрогаў. Просьба да ячэек МОПР'у вылучыць дэлегацыі, якім зьявіцца са сьцягамі ў 4 з паловаю гадзіны ўвечары на вакзал МББ.

ЦК МОПР'у Бел.

Цэнтральны камуністычны клюб імя Карла Маркса.

Аўторак.—Пастаноўка «Амбаз». Усім удзельнікам пастаноўкі зьявіцца да 7 г. увечары. Просьба не спазьніцца.

Вечар рабочай моладзі.

3-га студзеня а сёмай гадзіне ўвечары адбудзецца вечар, прысьвечаны кастрычнікаўскаму вакліку рабочай моладзі ў камсамол. Білеты на райкомах.

Канфэрэнцыя гурткоў самаадукацыі.

4-га студзеня, а восьмай гадзіне ўвечары, у цэнтральным габінэце агітарэкпрацы (клюб К. Маркса, вул. Энгельса) адбудзецца канфэрэнцыя членаў гурткоў самаадукацыі і індывідуалаў, якія вывучаюць гісторыю УсеКП(б). Яўка ўсіх паказаных таварышоў абавязкова.

Бюро самаадукацыі пры АПА АК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Яч АСЬТУЎ.

ТЭАТР, КІНО.

Кіно-тэатр „Культура" — Сучасная драма „ЖЕНА", у 6-ці част. Зьвыш праігр. РЫЧАРД ТОЛМЭДЖ у камэдыі „ЛОВКИЕ ДЕЛЬЦЫ", у 6-ці част.

Кіно „Чырвоная Зорка". Новая замежная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ", маст.-псыхал. драма у 6 ч. АНОНС! НАСТУПНАЯ ПАСТАНОЎКА „ВЕЧНАЯ БОРЬБА".

Кіно „Пралетары". „ВАША ЗНАКОМАЯ", сучасная бытавая драма ў 6 часьцях.

Кіно „Інтэрнацыянал". 3-я АПОШНЯЯ СЭРЫЯ 3-я „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ" Трука-прыключ. кіно-раман у 3 частках.

ДОКТОР Г. А. ГИНЗБУРГ переехал на Октябрьскую ул. (быв. Крещенская), № 8, тел. 11-38.

НИККЕЛИРОВОЧНАЯ МАСТЕРСКАЯ Советская, 24, дом Металлистов принимает с гарантией самовары, никкел. кровати и др. металлические вещи.

ГОСИЗДАТ РСФСР
ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА 1928 ГОД
НА НОВЫЙ ЖУРНАЛ
ВЕСТНИК ИНОСТРАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ
Орган международного бюро революционной литературы. ВЫХОДИТ ЕЖЕМЕСЯЧНО.

Отв. ред. А. В. Луначарский.
РЕДКОЛЛЕГИЯ: Луначарский, А., Авербах, Л., Бескин, О., Янсон, Я. (СССР), Барбюс Анри, Вайян Кутюрье (Франция), Бехер Иоганнес (Германия), Вайскопф, Ф. (Чехо-Словакия), Истрати, П. (Балканы), Станда, И. (Польша), Турене Нерман (Скандинавия), Джозеф Фримси (Америка), Бела Илеш (Венгрия), Курелла.

ЗАДАЧИ ЖУРНАЛА: ознакомление широких читательских масс СССР с лучшими образцами современной литературы Запада и Востока.
В ЖУРНАЛЕ ПОМЕЩАЮТСЯ НОВИНКИ: иностранной литературы, информации культурной жизни Запада, театр, кино, декоративное и производственное искусство и т. д. Критические статьи о течениях в школах иностранной литературы, об иностранных писателях и пр.
Читатели журнала получат возможность быть в курсе наиболее значительных литературных и общекультурных явлений зарубежных стран.

СОДЕРЖАНИЕ № 1: Синклер Льюис.—Проститутки. Роман. Панаит Истрати.—Михаил. Роман. Анри Барбюс.—Правдивые рассказы. Хансн.—Десять ночей. Японские рассказы. Вейскопф, Ф.—Солдат революции. Барта, А.—Паника в городе. Рассказ. Менкен.—„Amerikana". СТИХИ: Иоганнес Бехер, Р. Станда, К. Сендберг, А. Гидаш. СТАТЬИ: А. Луначарский, Луи Лозовик, А. Анисимов, С. Динамов, Б. Рейн, Бела Илеш и М. Левидов. БИБЛИОГРАФИЯ. —(ХРОНИКА)—

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: на год—10 р., на 6 мес.—5 р. 50 к., на 3 мес.—3 р. Цена отдельного номера 1 р.
ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: в Минск. Отделении Госиздата РСФСР, г. МИНСК, Советская, 41, в русских книжных отделах Белгиза, во всех почтово-телеграфных конторах и у письмоносцев.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Пашпарт Камарова Е. М., выд. Менміліцыяй. 1181
Сяброўская кн. Бардзына А. М., выд. саюзам хімікаў. 1182
Справка Шыманскага С. А., выд. ВДУ. 1183
Выпіс аб шлюбе Шыманскага С. А., выд. Сурасскім сельсаветам. 1184
Метрычная выпіс Шыманскага С. А., выд. Краўпаўскім сельсаветам. 1185
Лекавая кн. Шыманскага С. А., выд. Віцебскай страхкасай. 1186
Лекавая кн. Холада М. [illegible], выд. Менстрахкасай. 1187
Квіткавая кн. № 12.350 Хо[illegible] М. В., выд. МНРП. 188
Пашпарт Кортка Ю. С., выд. [illegible] 1198
Дапрызыўная кн. Рымашэўскага У. К., выд. Менвасінкамбінат. 1192
Конская картка Рымшэўскай І., выд. Капыльскім РВК. 334
Паквая кн. Юшко В. Я., выд. Сьмілавіцкім спажывецкім таварыствам. 335
Вайсковая кн. Корсака А., выд. Резоўскім РВК.
Метрычная справка Проц[illegible] Сьмілавіцкім РВК.
Асабовая картка Бараноўс[illegible] Хазопеніцкім РВК. [illegible]
Асабовая кн. Довгіль Р. Ш., выд. 26 адд. ротай. 389
Пас Сабалеўскага А., выд. Барадынавіцкім сельсаветам. 340
Асабовае пасьведчаньне Гурыновіча П., выд. 15 дар. будаўніцкім пунктам. 341

ПРАДАЕЦЦА
ЗРЫЎ-ПАПЕРА, макулатура і старыя газэты
— Цана зьнижана —
Зварочвацца ў галоўную кантору газ. «Зьвязда». Савецкая, 63, 3-ці паверх.

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 50 кап.